# ГЕАГРАФІЧНАЯ СТРУКТУРА АДВЕНТЫЎНАЙ ФРАКЦЫІ ФЛОРЫ ПРЫПЯЦКАГА ПАЛЕССЯ (БЕЛАРУСЬ)

**А. М. Мялік**

Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі, Мінск, Беларусь, aleksandr-myalik@yandex.by

У артыкуле разглядаецца геаграфічная структура заносных відаў флоры Прыпяцкага Палесся – прыроднага рэгіёна ў цэнтры Беларускага Палесся. Адзначана, што сярод 1281 адвентыўнага віда больш шматлікімі з'яўляюцца расліны, натуральны арэал якіх займае паўднёвыя і ўсходнія рэгіёны Еўропы, Міжземнамор'е, Паўночную Амерыку, а таксама Сібір, цэнтральную і ўсходнюю часткі Азіі. Віды з умераных шырот адзначаных тэрыторый з'яўляюцца больш шматлікімі ў складзе спантаннай флоры, якая налічвае 1521 від.

***Ключавыя словы***: заносныя віды; першасны арэал; радзіма раслін; трансфармацыя флоры.

# GEOGRAPHICAL STRUCTURE OF THE ADVENTIVE FLORA OF THE PRIPYAT POLESIE (BELARUS)

**A. M. Mialik**

Central Botanical Garden of the National Academy of Sciences of Belarus,
Minsk, Belarus, aleksandr-myalik@yandex.by

The article examines the geographical structure of the adventive flora of the Pripyat Polesie (natural region of the southern part of Belarus). It was found that among 1281 adventive species, plants from the adjacent regions of Europe, the Mediterranean, North America and Asia are more numerous. Among the 640 adventive species prone to naturalization, natives of the temperate latitudes of Eurasia and North America prevail.

***Key words***: alien plants; primary area of plants; homeland of plants; transformation of flora.

Тэрыторыя Прыпяцкага Палесся займае цэнтральную частку поўдня Беларусі і з'яўляецца асобнай фізіка-геаграфічнай акругай. Сучасная флора дадзенага рэгіёна з улікам вырошчваемых інтрадуцэнтаў прадстаўлена 2162 відамі сасудзістых раслін, якія адносяцца да 842 родаў і 172 сямейств. Сярод іх 881 від з 370 родаў і 117 сямейств з'яўляецца абарыгенным. Адвентыўная фракцыя прадстаўлена 1281 відам (621 род і 132 сямейства), сярод якіх 641 таксон вядомы толькі ва ўмовах культуры. Усяго 640 заносных відаў сустракаюцца ў паўнатуральных і натуральных фітацэнозах. Такім чынам, спантанная флора Прыпяцкага Палесся прадстаўлена 1521 відам, якія адносяцца да 605 родаў і 141 сямейства [1].

З улікам таго, што 42 % відаў спантаннай флоры даследуемага рэгіёна па свайму паходжанню з'яўляюцца адвентыўнымі, іх дасканалае вывучэнне мае важнае значэнне для ацэнкі маштабаў антрапагеннай трансфармацыі флоры і сучасных трэндаў яе развіцця.

Немалаважнае значэнне пры аналізе асаблівасцяў адвентыўнага кампанента флоры належыць высвятленню паходжання гэтых відаў – усталяванню іх першаснага (наткральнага) арэала або радзімы. У цяперашні час сярод навукоўцаў не існуе адзінага падыходу да вызначэння паняцця «радзіма раслін» і адпаведна методыкі правядзення геаграфічнага аналізу адвентыўнай фракцыі флоры. Разам з тым, вызначэнне геаграфічнай структуры заносных відаў мае такое ж важнае

значэнне для вывучэння паходжання адвентыўнай фракцыі флоры як і высвятленне часу і спосабу заноса раслін, а таксама ступені іх натуралізацыі ў прыродных умовах даследуемага рэгіёна [2].

Для вызначэння геаграфічнай структуры адвентыўнай фракцыі флоры Прыпяцкага Палесся прынята пазіцыя В. В. Пратапопавай, згодна якой пад радзімай адвентыўных відаў разумеецца тая частка зямной паверхні, дзе заносныя для вывучаемый флоры віды раслін растуць у натуральным стане [3]. На малюнку прадстаўлены спектр першасных арэалаў заносных відаў флоры Прыпяцкага Палесся.




Малюнак – Спектр першасных арэалаў відаў адвентыўнай фракцыі флоры Прыпяцкага Палесся

Прадстаўленыя дадзеныя паказваюць, што большасць заносных відаў (33,25 %) паходзяць з розных рэгіёнаў Еўропы. Першасны арэал многіх з іх займае паўднёвую (*Daucus carota* L., *Salvia sclarea* L. і інш.), заходнюю (*Armeria maritima* (Mill.) Willd., *Petrorhagia saxifraga* (L.) Link і інш.), або ўсходнюю (*Acer tataricum* L., *Amygdalus nana* L. і інш.) частку еўрапейскага кантынента. Усяго 284 еўрапейскіх відаў (ці 66,82 %) здолелі натуралізавацца ва ўмовах поўдня Беларусі. Некаторыя з іх з’яўляюцца абарыгеннымі для сумежных тэрыторый Украінскага Палесся (*Carlina cirsioides* Klokov), Брэсцкага Палесся (*Galanthus nivalis* L.), або заходняй часткі Перадпалесся (*Abies alba* Mill.).

Паўночная Амерыка з’яўляецца радзімай 241 адвентыўнага віда. Значная частка раслін дадзенай групы (*Rudbeckia hirta* L., *Acer saccharinum* L., *Quercus coccinea* Münchh. і інш.) паходзіць з умераных шырот гэтага кантынента, што спрыяе натуралізацыі 119 паўночнаамерыканскіх відаў ва ўмовах поўдня Беларусі.

Радзімай 231 адвентыўнай расліны з’яўляюцца розныя рэгіёны Азіі: Сібір (*Draba sibirica* (Pall) Thell., *Larix sibirica* Ledeb. і інш.), Далёкі Ўсход (*Eleutherococcus senticosus* (Rupr. Ex Maxim.) Maxim., *Schisandra chinensis* (Turcz.) Baill . і інш.), Японія і Кітай (*Abies koreana* E.H Wilson, *Astilbe simplicifolia* Makino і інш.), цэнтральная (*Salsola collina* Pall., *Tulipa turkestanica* Regel і інш.) ці паўднёва-ўсходняя частка (*Cucumis sativus* L., *Coix lacryma-jobi* L. і інш.). Усяго 69

азіяцкіх відаў (каля 30 % ад іх агульнай колькасці) натуралізаваліся ва ўмовах Прыпяцкага Палесся.

Амаль 10 % адвентаўных відаў (122 прадстаўнікі) былі занесены з Міжземнамор’я. Многія з іх (каля 30 %) з’яўляюцца археафітамі і прадстаўлены традыцыйнымі сельскагаспадарчымі культурамі (*Brassica oleracea* L., *Linum usitatissimum* L. і інш.), або пустазеллем (*Agrostemma githago* L., *Spergula arvensis* L. і інш.). Значная частка такіх раслін (55 відаў) паспяхова натуралізавалася ва ўмовах Беларускага Палесся. Сярод неафітаў міжземнаморскага паходжання больш шматлікімі з’яўляюцца расліны, вядомыя толькі ва ўмовах культуры: *Chionodoxa forbesii* Baker, *Reseda odorata* L. і шэраг іншых.

Паходжанне 85 відаў цесна звязана з дзейнасцю чалавека. Да іх адносяцца адвентыўныя віды гібрыднага (*Gladiolus* × *hortulanus* L.H. Bailey, *Lilium* × *hybridum* hort. і інш.) або культыгеннага паходжання. Сярод апошніх больш шматлікія прадстаўнікі сямейства *Rosaceae*, якія здаўна вырошчваюцца ў садах: *Armeniaca vulgaris* Lam., *Malus domestica* Borkh. і іншыя. Удзельная вага відаў антрапагеннага паходжання ў складзе флоры Прыпяцкага Палесся ў цяперашні час складае 6,63 % і пастаянна ўзрастае. Многія з іх (*Gaillardia* × *grandiflora* Van Houtte, × *Sorbaronia mitschurinii* (A.K.Skvortsov et Maitul.) Sennikov і інш.) схільныя да натуралізацыі ва ўмовах поўдня Беларусі і праяўляюць інвазійныя ўласцівасці.

Радзімай 42 відаў з’яўляецца Міжземнаморскі-Ірана-Туранская вобласць. Сярод іх больш шматлікія археафіты (*Anagallis arvensis* L., *Papaver rhoeas* L. і інш.), вядомыя ў Беларусі як рудэральныя расліны і пустазелле.

З Паўднёвай Амерыкі на тэрыторыю Прыпяцкага Палесся быў занесены 41 від, прадстаўлены за невялікім выключэннем (*Galinsoga parviflora* Cav., *Xanthium spinosum* L. і інш.) вырошчваемымі раслінамі (*Arachis hypogaea* L., *Phaseolus coccineus* L. і інш.). Толькі 14 паўднёваамерыканскіх відаў (*Nicandra physalodes* (L.) Gaertn., *Portulaca grandiflora* Hook. і інш.) адзначаны па-за межамі мест вырошчвання.

Каўказ з’яўляецца радзімай 29 заносных відаў (*Medicago lupulina* L., *Melilotus officinalis* (L.) Lam. і інш.), а размешчаная побач Ірана-Туранская вобласць – толькі 26 (*Anethum graveolens* L., *Lepidium ruderale* L. і інш.). Каля паловы прадстаўнікоў гэтых груп адзначаны на розных стадыях натуралізацыі.

Усяго 26 відаў маюць афрыканскае паходжанне (*Dolichos lablab* L., *Linum grandiflorum* Desf., *Lobelia erinus* L. і інш.), а з Аўстраліі і Новай Зеландыі было занесена толькі 9 раслін (*Carex flagellifera* Colenso, *Craspedia globosa* (Bauer ex Benth.) Benth., *Rhodanthe manglesii* Lindl. і інш.). Прадстаўнікі дадзеных груп за выключэннем *Citrullus lanatus* (Thunb.) Matsum. et Nakai і *Sorghum sudanense* (Piper) Stapf вядомыя толькі ў культуры. Радзіма 3 адвентыўных прадстаўнікоў флоры (напрыклад, *Rubus laciniatus* Willd.) дакладна не ўстаноўлена.

Такім чынам, геаграфічны аналіз адвентыўнай фракцыі флоры Прыпяцкага Палесся паказвае, што ў яе складанні найбольшае значэнне маюць віды, радзімай якіх з’яўляюцца ўмераныя шыроты Паўночнай Амерыкі, Азіі, Еўропы і Міжземнамор’е. Усё большае значэнне ў складанні адвентыўнага кампанента флоры займаюць віды антрапагеннага паходжання, што тлумачыцца інтэнсіўнай інтрадукцыяй новых дэкаратыўных раслін гібрыднага паходжання.

**Библиографические ссылки**

1. Мялик А. Н. Оценка современного состава флоры сосудистых растений Припятского Полесья // Научные стремления – 2019 : сб. материалов Междунар. науч.-

практ. конф. в рамках науч.-практ. инновац. форума «INMAX'19», Минск, 11–12 дек. 2019 г.: в 3 ч. / ОО «Центр молодёжных инноваций» [и др.]. Минск, 2019. Ч. 1. С. 31–32.

2. Третьяков Д. И. Адвентивная фракция флоры Беларуси и её становление // Изучение биологического разнообразия методами сравнительной флористики : материалы IV раб. совещ. по сравн. флористике, Берез. биосфер. заповедник, 1993 г. / Рос. акад. наук [и др.] ; редкол.: Б. А. Юрцев (отв. ред.). СПб, 1998. С. 250–259.

3. Протопопова В. В. Синантропная флора Украины и пути её развития. Киев : Наук. думка, 1991. 202 с.

4. Мялик А. Н. Особенности современного состава адвентивного компонента флоры Припятского Полесья // Изучение адвентивной и синантропной флор России и стран ближнего зарубежья: итоги, проблемы, перспективы : материалы V Междунар. науч. конф., Ижевск, 6–8 сент. 2017 г. / Удмурсткий гос. ун-т [и др.] ; под ред. О. Г. Барановой и А. Н. Пузырёва. Ижевск, 2017. С. 87–90.